УДК 821.161.3

***Н.М. Дамброўская***

# ЛІРА-ЭПІЧНАЯ ПАРАДЫГМА ПРОЗЫ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА

Артыкул прысвечаны аналізу ліра-эпічнай парадыгмы прозы аднаго з выдатных прадстаўнікоў філалагічнага пакалення Вячаслава Адамчыка. Эвалюцыя прозы В. Адамчыка да лірызацыі, паглыблення псіхалагічнага, медытатыўнага, філасофска-аналітычнага пачаткаў і праз гэта – да родава-жанравай і стылявой сінтэтычнасці пацверджана вынікамі статыстычнага аналізу частотнасці выкарыстання пісьменнікам у апавяданнях дыялогаў, разнапланавых маналогаў, пейзажных замалёвак, гістарычных экскурсаў.

Літаратура другой паловы ХХ стагоддзя пад уплывам грамадскіх падзей і ў сувязі з неабходнасцю замены нарматыўнага (у межах сацыялістычнага рэалізму) пісьма больш свабодным паглыбляла і пашырала тэматычны дыяпазон, пераадольвала родава-жанравую і стылявую зададзенасць. Гэтая тэндэнцыя адбілася і на творчасці прадстаўнікоў філалагічнага пакалення літаратараў, дапамагла ёй стаць больш разнастайнай і дасканалай.

Тыповым прадстаўніком літаратуры, якая пераадольвала як зместавую, так і фармальную нарматыўнасць, ішла да родава-жанравай і стылявой «разамкнёнасці», можна лічыць Вячаслава Адамчыка (1933–2001). У стылі В. Адамчыка, як і іншых прадстаўнікоў яго пакалення, спалучаюцца рэалістычныя, рамантычныя і мадэрнісцкія адзнакі пісьма пры відавочнай перавазе першых. Агульную эвалюцыю творчасці пісьменніка можна прадставіць як рух ад знешнепадзейнай апісальнасці, ілюстрацыйнасці, выяўленчасці, ад слоўна-вобразнай адкрытасці і прастаты да лірызму і цесна звязанаму з ім аналітызму, да сэнсава-вобразнай ускладненасці, заглыблення ў сферу свядомага і падсвядомага, філасофскага асэнсавання рэчаіснасці, шматграннасці і спалучэння мастаком у познім перыядзе творчасці адзнак, уласцівых эпічнаму, лірычнаму і драматычнаму пісьму.

З мэтай пацвярджэння верагоднасці канцэпцыі пра агульную родава-жанравую і стылявую эвалюцыю прозы В. Адамчыка намі быў праведзены статыстычны аналіз ужытых пісьменнікам дыялогаў, разнапланавых маналогаў (маналогі «душы і сэрца» героя, аўтара, аўтара-героя), лірычных адступленняў, якія групаваліся наступным чынам: пейзажныя замалёўкі, гістарычныя экскурсы, псіхалагізаваныя (суб’ектывізаваныя) партрэты персанажаў. На аснове аналізу 45 апавяданняў (зборнікі «Свой чалавек» (1958), «Млечны шлях» (1960), «Міг бліскавіцы» (1965), «Дзікі голуб» (1972), «Развітальная аповесць» (1999), «Нязрушаны камень» (2002)) мы прыйшлі да высновы пра сінтэтычны характар прозы В. Адамчыка ў цэлым паводле выкарыстання адзнак трох класічных родаў слоўнага мастацтва. Аднак у розныя перыяды творчасці пісьменніка колькасныя суадносіны прыкмет пісьма розных літаратурных родаў вар’іруюцца.




**Малюнак 1 – Тэндэнцыя маналагізацыі прозы В. Адамчыка**

маналогі «душы і сэрца» героя/аўтара/аўктора;
экспрэсіўныя дыялогі




**Малюнак 2 – Пейзажныя замалёўкі**




**Малюнак 3 – Гістарычныя экскурсы**

Так, з 1957-га па 1960-я гады вядучую ролю ў мастацкай сістэме В. Адамчыка адыгрывае эпічнае пісьмо. Пра гэта сведчыць невялікая колькасць разнапланавых маналогаў (малюнак 1), пейзажных замалёвак (малюнак 2), гістарычных экскурсаў (малюнак 3) і вялікая колькасць выпадкаў ужывання дыялогаў, што натуральна для эпічнага роду літаратуры (малюнак 1).

З цягам часу проза В. Адамчыка лірызуецца. Як сведчаць малюнкі, гэты працэс асабліва актыўна адбываецца ў перыяд з першай паловы 1960-х гадоў па 1972 год. У гэты час у апавяданнях празаіка скарачаецца ў цэлым колькасць дыялогаў (малюнак 1), значна павялічваецца колькасць маналогаў (малюнак 1) і гістарычных экскурсаў (малюнак 3). Пейзажныя замалёўкі, якія раней былі, як правіла, аб'ектывізаваныя і дакладна перадавалі рэаліі наваколля, становяцца суб'ектывізаванымі, ператвараюцца ў аўтарскі роздум аб чалавечай экзістэнцыі. Як відаць з малюнка 2, «пік» колькасці пейзажных замалёвак прыходзіцца на канец 1960-х – пачатак 1970-х гадоў.

Назіранні над апавяданнямі В. Адамчыка канца 1980-х – 2000-га гадоў абагульнена можна прадставіць наступным чынам. У гэты перыяд (пры дамінуючай ролі лірычнага роду літаратуры) аўтар усё часцей звяртаецца да прыёмаў пісьма, уласцівых эпічнаму і драматычнаму родам. Доказам выказанага тэзіса могуць служыць вынікі статыстычнага падліку. Так, у апавяданнях двух апошніх зборнікаў прозы пісьменніка («Развітальная аповесць» (1999), «Нязрушаны камень» (2002)) значна памяншаецца колькасць пейзажных замалёвак (малюнак 2), часцей, у параўнанні з 1960-мі гадамі, ужываюцца дыялогі (малюнак 1).

Стыль пісьма В. Адамчыка канца 1980-х – 2000-га гадоў набывае сінтэтычны характар. Мастацкая «сінтэзнасць» прозы пісьменніка, у першую чаргу малых жанравых формаў, прыводзіць да таго, што часам у адным творы сумяшчаюцца адзнакі

эпасу, драмы і лірыкі (аповесць «Падарожжа на Буцафале», апавяданні «Смерць на парозе», «Ноч на Галавасека», «Сон у калядную ноч», «Нязрушаны камень»). Гэтыя і некаторыя іншыя творы пабудаваныя на драматычных, напружаных сюжэтных калізіях, вострых канфліктных сітуацыях, тэкстам нададзены характар адкрытай ці прыхаванай дыялогавасці (адзнакі драматычнага роду літаратуры); прыкметы эпасу праяўляюцца ў апавядальнасці, разгорнутасці сюжэтаў, знешняй аддаленасці аўтара ад «матэрыялу», ва ўвядзенні ў мастацкую тканіну твораў аб’ектывізаваных, «самастойных» персанажаў; лірызм жа выяўляецца пераважна ў асаблівай эмацыйнай афарбоўцы тэкстаў, у перадачы ўзрушанага душэўнага стану герояў.

Для доказу наяўнасці родава-стылявой дыфузіі ў прозе В. Адамчыка спынімся на аповесці «Падарожжа на Буцафале» (1991), у якой, на нашу думку, найбольш яскрава выявілася паліфанічнасць, шматграннасць пісьма аўтара. У творы выразна заўважаюцца адзнакі фантастычнага, эпічнага, дакументальнага, эмацыянальна-выяўленчага (прадметна-апісальнага), дыдактычна-павучальнага, сатырычнага пісьма.

У аснову сюжэта аповесці пакладзена неверагодная гісторыя пра перамяшчэнне ў часе галоўных герояў – героя-апавядальніка і яго шафёра Толі Аляшкевіча. У аповесці В. Адамчыка час рухаецца не наперад, як звычайна, а назад. За даволі кароткі яго прамежак падарожнікі становяцца сведкамі падзей, якія адбываліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XIX – першай палове XX стагоддзя.

«Падарожжа на Буцафале» вызначаецца эпічным характарам аповеду. Аўтар імкнецца спасцігнуць гістарычнае значэнне эпохі XIX і XX стагоддзяў для беларускага народа, а «прага ведаць і спасцігнуць мінулыя стагоддзі як сучаснасць – <…> гэта покліч эпічнага таленту» [1, с. 547]. Выхад на актуальныя праблемы сучаснасці і стварэнне сваёй мастацка-эстэтычнай мадэлі рэчаіснасці В. Адамчык ажыццяўляе праз зварот да гістарычнага, сацыяльна-маральнага вопыту мінулых пакаленняў. Асэнсоўваючы яго, пісьменнікі бачаць адну з прычын трагічнага стану сучаснага ім грамадства ў адсутнасці ў большасці суайчыннікаў гістарычнай памяці.

У аповесці В. Адамчыка выразна выяўляецца дакументальны пачатак, згадваюцца гістарычныя, грамадска-культурныя падзеі, што мелі месца на тэрыторыі сучаснай Беларусі, распавядаецца пра рэальныя выпадкі і здарэнні, якія адбываліся з аднавяскоўцамі, з продкамі аўтара па бацькоўскай і мацярынскай лініі, захоўваюцца нават іх імёны. Мастак слова праяўляе сур’ёзную і глыбокую зацікаўленасць у веданні генеалагічнага дрэва свайго роду, таму пісьменнік асабліва цікавіцца летапісамі, старадаўнімі кнігамі.

Звернем увагу на дыдактычна-павучальны стылявы пачатак аповесці. На нашу думку, дыдактызм – часта схаваны ў падтэкст – з’яўляецца ідэйна-пафаснай асновай гэтага твора. Для аповесці В. Адамчыка характэрны наступны мастацкі «ход»: думкі, пачуцці, перажыванні героя-апавядальніка паступова пераходзяць у дыдактычны матэрыял, захоўваючы пры гэтым пачуццёвасць, эмацыянальнасць. «Сэрца радасна закалацілася – я бачыў той старадаўні лес <…>, бачыў тыя вялікія камяні, на якіх сядзеў босы ў падлеткавыя гады. Іх ужо сцягнула з поля і раскрышыла маё пакаленне, для каго ўжо не было і няма нічога святога на тутэйшай зямлі. <…> Навучыўшыся крышыць камяні, можна раскрышыць усё», – адзначае пісьменнік [2, с. 410]. Пераводзячы эмацыянальна-выяўленчае, экспрэсіўнае апісанне ў плоскасць дыдактызму, аўтар акцэнтуе ўвагу на актуальных праблемах сучаснай яму рэальнасці: экалагічная сітуацыя, наркаманія, праблема неперспектыўных вёсак, бюракратызм, прыстасавальніцтва. В. Адамчык паказвае драматычную праўду жыцця, відавочныя праявы маральна-этычнай, сацыяльнай і нацыянальнай дэфармацыі грамадства канца XX стагоддзя.

Дыдактызм выяўляецца ў аповесці В. Адамчыка не толькі праз непасрэдную аўтарскую ацэнку рэчаіснасці, прамыя, адкрытыя выказванні пісьменніка, але і праз сатырычны пафас і блізкія яму разнавіднасці – гумарыстычны, іранічны, саркастычны. Моцны сатырычны пачатак твора адзначаў В.А. Каваленка: «На першы погляд можа здацца, што аповесць «Падарожжа на Буцафале» – гэта іранічнае падагульненне зместу цыкла раманаў. <…> Безумоўна, гэта літаратурны калаж з раней напісанага. І ўсё ж ідэйны змест аповесці шырэй» [1, с. 547]. Твор насычаны тонкімі намёкамі, а многія яго сюжэтныя павароты афарбаваны гумарам, іроніяй. Так, калі скончылася неверагоднае падарожжа, наратар з вялікім шкадаваннем канстатуе: «Мы вярнуліся назад у наш касмічны і непаўторны век, дзе выхад за борт міжпланетнага карабля даволі небяспечны» [2, с. 416]. Элементы сатыры і гумару з'яўляюцца актыўнымі сродкамі аўтарскай характарыстыкі з'яў і герояў. Напрыклад, заганы сучаснага пісьменніку грамадства выяўляюцца празаікам праз стварэнне вобразаў некаторых персанажаў. Так, польскі афіцэр нагадвае апавядальніку сакратара шматлікіх творчых секцый, які «гадоў сорак назад напісаў усхваляваны артыкул <…> і з таго часу нязменна і паважна сядзеў ва ўсіх прэзідыумах, дзеля чаго нават нашыў на локці свайго пінжака нязносныя, са штучнай скуры, латкі» [2, с. 344]. Гэты крытык, як трапна падмячае В. Адамчык, «ашчаслівіў літаратуру тым, што болей не пісаў» [2, с. 344].

Для «Падарожжа на Буцафале» В. Адамчыка характэрны і эмацыянальна-ацэначны, экспрэсіўны пафас. Інтанацыя аповесці ўзрушаная, аповед насычаны аўтарскімі адступленнямі. Экспрэсіўная мова твора, паскораны тэмп аповеду ствараюць эфект павышанай эмацыянальнасці. Лірычны пачатак выяўляецца ў пейзажных замалёўках (хоць і невялікіх, але каларытных, маляўнічых), у шматлікіх аўтарскіх лірычных адступленнях, рэтраспекцыях, успамінах пра незваротнае дзяцінства. На працягу ўсяго падарожжа герояў суправаджаюць краявіды, якія цешаць душу сваім хараством: «Пахла прэснаю травою, ветрам, сухім гаркаватым пяском, старадаўнасцю і дзяцінствам. Я захлынуўся ад паўнаты шчасця» [2, с. 389]; «Няўжо я бачу наяве тое, што бясследна знікла з зямлі? Нешта салодка і разам з тым балюча зашчымела ў маёй душы» [2, с. 359]. Такім чынам, у аповесці актыўна ўзаемадзейнічаюць адзнакі эпічнага, дакументальнага, эмацыянальна-выяўленчага (прадметна-апісальнага), дыдактычна-павучальнага, фантастычнага, спавядальнага, сатырычнага пісьма, што спрыяе арыгінальнаму, адметнаму выяўленню аўтарскай пазіцыі, глыбейшай рэалізацыі творчай задумы мастака слова.

Як ужо адзначалася вышэй, у канцы 1980-х – 2000-м гадах В. Адамчык больш актыўна выкарыстоўвае эпічныя формы адлюстравання рэчаіснасці: паглыбляецца пластычнасць аўтарскага пісьма, сам ён карыстаецца даўнімі традыцыямі малюнкавага жывапісу словам, стварэння аб'ёмных, закончаных карцін жыцця. У фокусе ўвагі пісьменніка ў многіх апавяданнях позняга перыяду творчасці знаходзіцца асоба чалавека, сфарміраваная пэўнымі сацыяльна-побытавымі і грамадска-гістарычнымі абставінамі (у большасці выпадкаў дэструктыўнымі), у якой адлюстроўваецца дысгарманічная рэчаіснасць. Зрухі ў творчасці В. Адамчыка ў змястоўным плане выклікалі пэўныя змены і ў адносінах фармальных. У пэўным сэнсе некаторыя апавяданні набліжаюцца да жанру навелы з уласцівымі ёй імклівасцю, напружанасцю дзеяння і нечаканай развязкай (аўтар сам вызначае жанравую прыналежнасць сваіх твораў: «Прылёт кажана (Недапісаная *навела*)», «Бронікі, альбо *Навела* пра каня» (вылучана намі. – Н.Д.)). У творах В. Адамчыка паслабляецца суб'ектыўна-ацэначны пачатак, акрэсліваецца ўстаноўка аўтара дыстанцыявацца ад свайго героя, апавядальная манера становіцца больш аб'ектывізаванай (у 1960–1970-я гады мела месца адваротная тэндэнцыя).

Важна адзначыць, што, нягледзячы на аб’ектывізаваную манеру пісьма, прысутнасць В. Адамчыка ў апавяданнях 1990-х – 2000-га гадоў вельмі адчувальная. Узмацненне эпічнага і драматычнага пачаткаў у творах В. Адамчыка гэтага перыяду адбіваецца на сюжэтах і характарах канфліктаў паміж чалавекам і грамадствам. Аднак эпічная сітуацыя і сацыяльны канфлікт праламляюцца ў фокусе індывідуальна-аўтарскага светабачання, за эпічнай вастрынёй сюжэта выразна прасочваюцца пачуццё асабістага болю, перажывання аўтарам трагізму, неўладкаванасці жыцця. Пісьменнік акцэнтуе ўвагу рэцыпіента не на знешняй займальнасці, інтрызе, а на ўнутраным сюжэце, на гісторыі душэўнага прасвятлення героя («Развітальная аповесць») ці, што сустракаецца значна часцей, яго душэўнага ачарсцвення («Ці ён адзін?», «Смерць на парозе», «Ноч на Галавасека», «Удава», «Сон у калядную ноч» і інш.), на адкрытай ці незаўважнай дынаміцы барацьбы героя з абставінамі, асяроддзем.

Нягледзячы на актыўнае ўжыванне В. Адамчыкам у позні перыяд творчасці прыёмаў пісьма эпічнага і драматычнага родаў літаратуры, лірызм, як засведчылі аналіз апавяданняў і статыстычныя дадзеныя, выконвае вядучую ролю ў мастацкай арганізацыі большасці твораў пісьменніка. Кампазіцыйным ядром у такіх творах часцей за ўсё становяцца перажыванні аўтара ці героя, а ўвага пісьменніка акцэнтуецца на душэўным стане персанажа, на перадачы яго асабістага, суб’ектыўнага светаадчування. Проза В. Адамчыка позняга перыяду часцей вызначаецца лірыка-медытатыўным, філасофска-аналітычным характарам. Аб яе экзістэнцыйнай скіраванасці сведчыць шырокі спектр праблем і матываў сэнсу быцця, драматычна ўскладненага спасціжэння лірычным героем (часта ім з’яўляецца сам аўтар) навакольнага свету: «Усё прайшло, знікла, толькі не высыхаюць, высочваюцца на вачах, мае слёзы. Як хацелася калісьці ўцячы адсюль, з гэтага глухога абветранага поля, а як цяпер хочацца вярнуцца! Няўжо чалавечае жыццё – гэта супярэчнасць, радасна-злоснае памкненне да таго, чаго не можаш дасягнуць?» [3, с. 438]; «О, як шкода развітвацца з тым, што помніць твая душа. Бязлітасна і жорстка мяняецца ўсё на зямлі. Як навакольны свет прыроды, так і навакольны свет людзей, пакаленне за пакаленнем» [4, с. 104]. Лірызм уваходзіць у творы таксама і праз агульную настраёвасць – элегічна-журботную, сумна-тужлівую.

Аналіз апавяданняў В. Адамчыка засведчыў, што агульнай лірызацыі яго прозы спрыялі такія мастацкія прыёмы, як маналагізацыя мовы героя твора, яго аўтара і аўтара-героя (аўктора). Спавядальнасць, якая часта «афармляецца» ў творы ў форме маналога, з’яўляецца, як вядома, характэрнай прыкметай лірычнага роду літаратуры. Найбольшая колькасць разнапланавых маналогаў заўважаецца ў такіх апавяданнях В. Адамчыка, як «Па часе», «Урок арыфметыкі», «Пагарэльцы», «Аптэка нумар тры», «Калі ападае лісце», «Сон у калядную ноч», «Пах летняй травы», «Жывая вада», «Вяртаючыся да перажытага». Апошнія тры названыя творы ўяўляюць сабою суцэльныя маналогі «душы і сэрца» аўктора. Тэндэнцыя маналагізацыі прозы пісьменніка (малюнак 1) сведчыць пра паступовае ўзмацненне, паглыбленне ў ёй медытатыўнага і філасофскага пачаткаў.

Лірызацыя малой прозы В. Адамчыка дасягаецца ў ліку іншых і прыёмам рэтраспекцыі, зваротам у мінулае героя, у перажытае ім. Як сведчаць статыстычныя дадзеныя, да гэтага прыёму пісьменнік звяртаецца асабліва часта ў сярэдні і позні перыяды творчасці (малюнак 3). Пачынаючы са зборніка «Дзікі голуб», аўтар не пакідае ніводны твор без экскурсаў, часта ператвараючы аповед пра некалі перажытае персанажам у споведзь, у маналог. У дадзеным выпадку можна адзначыць актыўнае ўзаемадзеянне эпічнага і лірычнага пачаткаў у многіх творах В. Адамчыка.

Зыходзячы з усяго вышэйсказанага, можна зрабіць высновы пра агульны рух прозы В. Адамчыка да лірызацыі і да пашырэння прыёмаў эпічнага і драматычнага пісьма ў позні перыяд творчасці. Лірызм – адна з вызначальных рыс прозы мастака

слова. Лірызм уласцівы ўсім жанравым формам, да якіх звяртаўся пісьменнік-«шасцідзясятнік» на працягу творчага шляху (імпрэсія, лірычная мініяцюра, эсэ, апавяданне, аповесць, раман, нарыс, дзённікі). Аднак паступова «чыстая» лірызацыя саступіла месца шматграннасці, сінтэтызму (асабліва на завяршальным этапе творчасці), разнастайным жанравым (ліра-эпічным, ліра-драматычным, эпіка-драматычным) і стылявым (лірыка-аналітычным, лірыка-псіхалагічным, травесційным) мадыфікацыям.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / рэдкал.: У.В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1999–2003. – Т. 4, кн. 1 : 1966–1985 / НАН Беларусі; Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў ; Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2002. – 928 с.
2. Адамчык, В. Выбраныя творы : у 3 т. / В. Адамчык. – Мінск : Маст. літ., 1995. – Т. 1 : Чужая бацькаўшчына : раман ; Падарожжа на Буцафале : аповесць; Апавяданні. – 479 с.
3. Адамчык, В. Развітальная аповесць : Аповесць, апавяданні, дзённікі / В. Адамчык. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 447 с.
4. Адамчык, В. Ліст аканту : фрагменты дзённікаў / В. Адамчык // Маладосць. – 2001. – № 5. – С. 79–108.


***Dombrovskaya N.N.*** **Liro-epical Paradigm of Viacheslav Adamchyk's Prose**


In the article the liro-epical paradigm of one of the most significant representative of philological generation Viacheslav Adamchyk is analyzed. The author of the article shows the evolution of V. Adamchyk's prose to lyrical, psychological, meditative, philosophical, analytical manner of writing – and through this – to gender, genre and style synthesis. This thesis is proved by the results of statistic analyses of dialogues, monologues of various kinds, landscape descriptions and retrospections, used by the writer in his stories.


Рукапіс паступіў у рэдкалегію 29.03.2010